МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

вул. Калектарная, 10, 220004, г. Мінск
Тэл./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ул. Коллекторная, 10, 220004, г. Минск
Тел./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

21. 04. 2009 № 06-14/296

На № ____________

Цэнтральная Рада
Маладзежнага грамадскага
аб'яднання "Маладыя сацыял-
дэмакраты-Маладая Грамада"

Аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі
грамадскага аб'яднання

Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны матэрыялы адносна дзяржаўнай рэгістрацыі Маладзежнага грамадскага аб'яднання "Маладыя сацыял-дэмакраты –Маладая грамада" ( далей-МГА "МСД - МГ ").

У адпаведнасці з часткай першай артыкула 1 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" (далей-Закон) грамадскім аб'яднаннем з'яўляецца добраахвотнае аб'яднанне грамадзян, якія ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку аб'ядналіся на аснове агульнасці інтарэсаў для сумеснай рэалізацыі грамадзянскіх, сацыяльных, культурных і іншых правоў. Згодна з абзацам шостым часткі першай артыкула 20 Закона грамадскія аб'яднанні з моманту іх дзяржаўнай рэгістрацыі маюць права абараняць правы і законныя інтарэсы, а таксама прадстаўляць законныя інтарэсы сваіх членаў у дзяржаўных органах і іншых арганізацыях.

Вывучэнне прадстаўленых Міністэрству юстыцыі дакументаў аб дзяржаўнай рэгістрацыі МГА "МСД-МГ" паказала, што пункт чацверты Статута МГА "МСД-МГ" (мэты дзейнасці) не адпавядае вышэйназваным патрабаванням заканадаўства у частцы накіравання сваёй азначанай у мэтах дзейнасці на шырокае кола асоб, якія не з'яўляюцца членамі аб'яднання.

Акрамя таго, пункт 6.2. Статута МГА "МСД-МГ" супярэчыць абзацу трэцяму часткі другой артыкула 10 Закона.

Статут МГА "МСД-МГ" не адпавядае патрабаванням часткі трэцяй артыкула 9 Закона, а менавіта ў ім адсутнічае парадак уліку членаў грамадскага аб'яднання, парадак абскарджання рашэнняў органаў грамадскага аб'яднання, межы карыстання маемасцю грамадскага аб'яднання яго арганізацыйнымі структурамі.

У адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 15 Закона у выпадку неадпаведнасці устаноўчых дакументаў грамадскага аб'яднання патрабаванням заканадаўства, прымаецца рашэнне аб адмове ў яго дзяржаўнай рэгістрацыі.

На падставе выкладзенага і, кіруючыся абзацам чацвертым часткі трэцяй артыкула 14 і абзацам трэцім часткі трэцяй артыкула 15 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", рашэннем калегіі Міністэрства юстыцыі ад 17.04.2009 г. адмоўлена у дзяржаўнай рэгістрацыі Маладзежнага грамадскага аб'яднання "Маладыя сацыял-дэмакраты-Маладая Грамада".

Намеснік Міністра І.Г. Тушынскі